**НЯХАЙ ЖЫВЕ МАРКСІЗМ-ЛЕНІНІЗМ — ВЕЧНА ЖЫВОЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ ВУЧЭННЕ, ПУЦЯВОДНАЯ ЗОРКА ПРАЦОЎНЫХ УСІХ КРАІН У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЕРАМОГУ САЦЫЯЛІЗМА І КАМУНІЗМА!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1968 года).*



# ЛЕНІН І ЦЯПЕР ЖЫВЕЙ УСІХ ЖЫВЫХ

Ленінскія дні. Яны заўсёды радасныя і святочныя. Яны супадаюць з пачаткам вясны, калі ўсё ў прыродзе абуджаецца, набірае сілы, каб расквітнець, прынесці шчасце. Сёлета ленінскія дні ў нашым універсітэце, як і па ўсёй Беларусі, адзначаюцца пад дэвізам дастойнай падрыхтоўкі да слаўнага юбілею рэспублікі. Гэта бачна і па матэрыялах фота- і кніжных выставак, якія адкрыліся ў бібліятэках і на факультэтах, і па тэматыцы падрыхтаваных да навуковых канферэнцый дакладаў, і нават па дыпломных і курсавых працах студэнтаў. Так, мы звяраем свае крокі, свае поспехі з Леніным, яго бессмяротным вучэннем. Ацэньваючы дасягнутае, складаючы планы на будучае, мы зноў раімся з Леніным. І сёння актуальна гучаць словы вялікага паэта аб тым, што Ленін і цяпер жывей усіх жывых.

Наш універсітэт з гонарам носіць імя Леніна. Яго поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў, развіцці навукі і культуры вядомы не толькі за межамі рэспублікі, але і краіны. Толькі за апошні год выдадзены сотні манаграфій і падручнікаў універсітэцкіх аўтараў, а вялікая армія фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў, хімікаў, філолагаў, гісторыкаў і іншых спецыялістаў папоўніла рады будаўнікоў камунізма. Кожны факультэт падрыхтаваў да ленінскіх дзён свае падарункі. Гэта і новыя кнігі, і новыя выдатныя адзнакі студэнтаў, атрыманыя імі на семінарах, за пісьмовыя работы, гэта дзесяткі лекцый і дакладаў, якія былі прачытаны прафесарамі і выкладчыкамі на прадпрыемствах, у калгасах, вайсковых падраздзяленнях.

Жыццё і дзейнасць Леніна заўсёды выклікаюць вялікую цікавасць, глыбокі інтарэс. Сёння на другой старонцы мы расказваем аб Леніне-студэнце.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 15 (706) ● Пятніца 19 красавіка 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

# ЗАПРАШАЕМ НА НАВУКОВУЮ, СТУДЭНЦКУЮ...

Вялікае значэнне мае навукова-даследчая работа ў вну. Яна дапамагае студэнту правільна выбраць профіль, павышае яго веды, вучыць будучага спецыяліста лагічна мысліць.

У цяперашні час ва універсітэце навукова-даследчай работай займаецца звыш трох тысяч студэнтаў. З іх больш дзвюх тысяч з'яўляюцца членамі СНТ.

З мэтай абмену навуковай інфармацыяй паміж студэнтамі ў вну нашай краіны штогод праводзяцца навуковыя студэнцкія канферэнцыі, на якія запрашаюцца прадстаўнікі іншых гарадоў. Члены СНТ нашага універсітэта ў мінулым годзе пабывалі з дакладамі на канферэнцыях у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Адэсе, Львове, Таліне, Рызе, Вільнюсе, Каунасе, Тарту, Горкім, Казані, Тбілісі, Калінінградзе, Ужгарадзе і іншых. Шмат гасцей збіраецца і ў нас на традыцыйных студэнцкіх навуковых канферэнцыях, прысвечаных ленінскім дням.

22—25 красавіка гэтага года ва універсітэце адбудзецца XXV канферэнцыя. Адначасова з ёй будзе праходзіць першы тур конкурсу студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук і міжнароднага маладзёжнага руху. На 11 секцыях — грамадскіх навук, фізічнай, матэматычнай, хімічнай, біялагічнай, геолага-геаграфічнай, гістарычнай, журналістыкі, філалагічнай, юрыдычнай, інжынерна-тэхнічнай прадугледжваецца заслухаць больш 330 дакладаў. На канферэнцыю запрошаны студэнты з Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Львова, Тбілісі і многіх іншых гарадоў, а таксама прадстаўнікі вну БССР.

Канферэнцыя адкрыецца пленарным пасяджэннем, якое пачнецца 22 красавіка ў 18 гадзін вечара ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта. На пасяджэнні будуць падведзены некаторыя вынікі навуковай працы студэнтаў за прайшоўшы перыяд, атрымаюць узнагароды тыя, работы якіх былі прызнаны лепшымі ў 1967 годзе на рэспубліканскім аглядзе.

З 23 красавіка пачнуць работу секцыі. Даклады, прачытаныя на секцыях, будуць абмяркоўвацца, і аўтары лепшых работ будуць узнагароджаны граматамі і памятнымі падарункамі. Для ўдзелу ў рабоце секцый запрашаюцца выкладчыкі і студэнты усіх курсаў.

**Б. ЗАМСКІ,**
**старшыня СНТ універсітэта.**

# ЯГО ІМЯ Ў СЭРЦЫ КОЖНАГА

Студэнты універсітэта заўсёды з вялікай цікавасцю слухаюць тых, хто бачыў У. І. Леніна, выконваў яго даручэнні. Нядаўна на геолага-геаграфічным факультэце з такімі ўспамінамі выступілі старшыня Савета старых камуністаў Ленінскага раёна І. Д. Паўлаў і генерал-маёр у адстаўцы С. С. Сергіенка.

* * *

**Члены кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў 22 красавіка выступяць з дакладамі на тэарэтычнай канферэнцыі аўтазаводцаў, прысвечанай 98 гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.**

* * *

На чарговых занятках па тэме «Імя Леніна ў сэрцы кожным», якія адбыліся ў маладзёжным клубе «Радзіма» Мінскага камвольнага камбіната прынялі актыўны ўдзел в'етнамскія студэнты падрыхтоўчага факультэта нашага універсітэта Нгуен Тхі Вьет Хыонг і Нгуен Ван Бао. Яны расказалі маладым рабочым аб тым, як у В'етнаме ўшаноўваюць імя вялікага правадыра працоўных усяго свету, як чытаюць яго творы, як ажыццяўляюцца яго неўміручыя ідэі. Студэнт Нгуен Ван Бао прачытаў вершы в'етнамскіх паэтаў аб У. І. Леніне.

* * *

**Кафедра рускай мовы падрыхтоўчага факультэта 20 красавіка правядзе вечар «Мы гаворым па-руску», прысвечаны дню нараджэння У. І. Леніна. Студэнты кожнай вучэбнай групы — а іх усяго на факультэце 2 1— з дапамогай сваіх выкладчыкаў рыхтуюць вершы і песні аб Леніне. На вечары таксама выступяць з канцэртам калектывы мастацкай самадзейнасці падрыхтоўчага факультэта.**

# ВЯЛІКІ І ПРОСТЫ

У гэтыя дні ўся грамадскасць нашай краіны шырока рыхтуецца адзначыць 98-ую гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна. Да свята рыхтуюцца і работнікі універсітэцкай бібліятэкі. Яны наладзілі кніжную выстаўку: «22 красавіка — дзень нараджэння У. І. Леніна».

На выстаўцы змешчаны кнігі Леніна, успаміны аб ім. Тут можна ўбачыць творы М. Горкага, А. Папова, Б. Палявога, «Успаміны пра Леніна» В. Бонч-Бруевіча, «Сустрэча з Леніным» О. Лепяшынскай.

Не застаюцца незаўважанымі кнігі нямецкіх таварышаў «Незабыўны Ленін», «Апавяданні рабочых пра Леніна», кнігі «Вялікі, блізкі і просты» Г. Людвінскай, «Ленін — будаўнік новага свету» Б. Галіна, «Юнацтва правадыра» А. Белякова, «Вялікі і просты», напісаная па матэрыялах ленінскага кабінета і кватэры ў Крамлі аўтарамі З. Субоцінай, Л. Кузняцовай, Н. Маштаковай, «Наш Ленін» Б. Палявога і М. Жукава.

На выстаўцы можна прачытаць выказванні выдатных дзеячоў міжнароднага пралетарскага руху. Вось як гаварыў аб У. І. Леніне Вільгельм Пік: «Вечна будзе свяціць слова вялікага правадыра Леніна, які паказаў шлях да міру, дабрабыту і шчасця».

Запамінаюцца словы А. М. Горкага: «не было чалавека, які б так, як гэты, заслужыў у свеце вечную памяць».

**А. ХАЗЯНІН,**
студэнт 1 курса журфака.



СВЯТОЧНЫ ГОРАД ЛЕНІНА. Фота В. Поляка.

# СУСТРЭЧЫ, ЯКІХ НЕ ЗАБЫЦЬ

**Выкладчык нашага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, пісьменнік Павел Ткачоў, аўтар кнігі пра У. І. Леніна «Вішнёвая квецень» зараз працуе над новым творам пра Уладзіміра Ільіча — «Сустрэчы, якіх не забыць».**

**Сустрэчы з мясцінамі, дзе жыў Ленін, з дакументамі таго часу, з людзьмі, якія асабіста ведалі Ільіча — так нарадзілася кніга.**

**Урывак з другога раздзела мы прапануем увазе нашых чытачоў.**



У спякотны чэрвеньскі дзень 1887 года Ульянавы пакідалі Сімбірск. Пакідалі назаўсёды.

Павольна плыве параход. Павольна адыходзіць назад горад. Ужо ледзь відаць надпіс на блакітным доміку-прыстані — «Сімбірск». А хутка схаваецца і сам домік...

Сям'я Ульянавых пераязджае ў Казань. Было вырашана — Уладзімір Ільіч падасць заяву ў Казанскі універсітэт. Але чаму ў Казанскі? Мо лепш у Маскоўскі або Пецярбургскі?

**«Непасрэднай забароны паступіць у адзін са сталічных універсітэтаў яму (Уладзіміру Ільічу. — П. Т.) не было, — пісала Анна Ільінічна Ульянава, — але дырэктар дэпартамента паліцыі даў зразумець маці, што лепш яму падацца ў правінцыяльны універсітэт і лепш, калі ён будзе жыць пры ёй».**

З гэтым даводзілася лічыцца.

Зараз з Ульянаўска ў Казань можна трапіць па чыгунцы або аўтобусам. А яшчэ лепш, вядома, самалётам. Сеў — і праз якую гадзіну ў Казані. Але я вырашаю дабірацца параходам.

Развітальны гудок. Параход уздрыгвае, потым глыбока ўздыхае і ледзь прыкметна кранаецца з месца. Узыходжу на палубу і гляджу на горад, каб назаўсёды захаваць у памяці мясціны, дзе прайшло дзяцінства Уладзіміра Ільіча Леніна.

Пазней, у адказ на пытанне анкеты дэлегата X з'езда партыі «Якія мясцовасці Расіі ведаеце добра і колькі год там пражылі», — Уладзімір Ільіч Ленін напісаў: «Лепш за іншыя — Паволжа, дзе нарадзіўся і жыў да 17 год».

Перад ад'ездам з Масквы на радзіму Уладзіміра Ільіча я шмат часу правёў у Цэнтральным музеі Леніна. У першай зале сярод іншых экспанатаў маю ўвагу прыцягнула гравюра мастака Паўлава: «Ленін на параходзе едзе ў Казань». І вось цяпер яна, тая гравюра, нібы перад маімі вачыма. Уладзімір Ільіч у гімназіцкім шынялі сядзіць на лаўцы. У левай руцэ — шапка, правая — на парэнчах, а побач, на лаўцы, кніжкі. Задумёным позіркам сочыць ён за берагам.

Аб чым думае 17-гадовы Уладзімір Ульянаў? Што яго турбуе?

Можа, тады ў чэрвеньскі спякотны дзень 1887 года і быў знойдзены той адзіна правільны шлях, які ў 1917 годзе прывёў да перамогі наш народ?

Мы толькі ведаем адно — праз некалькі месяцаў Уладзімір Ільіч будзе ўдзельнічаць у студэнцкай сходцы і не толькі ўдзельнічаць, а з'явіцца адным з яе кіраўнікоў. Аб гэтым паведамляў папячыцель Казанскай вучэбнай акругі ў дэпартамент народнай асветы 14 чэрвеня 1888 года:

**«4-га снежня (Уладзімір Ульянаў. — П. Т.) кінуўся ў актавую залу ў першай партыі і разам з Палянскім першымі несліся з крыкам па калідору 2-га паверху, размахваючы рукамі, як бы жадаючы натхніць іншых...»**

Інакш кажучы, у 1887 годзе Уладзімір Ульянаў становіцца на шлях рэвалюцыянера...

А між тым параход наш прычальвае.

Казань... Горад, дзе пачалася рэвалюцыйная дзейнасць Уладзіміра Ільіча Леніна.

Ад прыстані трамваем дабіраюся ў цэнтр. Цудоўныя сучасныя будынкі, а побач старадаўнія помнікі — вежы Крамля, сабор Пятра і Паўла... заводы, фабрыкі... Усё гэта пакідае незабыўнае ўражанне. Цяпер горад Казань — сталіца Татарскай рэспублікі, адзін з буйнейшых прамысловых і культурных цэнтраў краіны. А якая была Казань таго часу, калі на яе вуліцах хадзіў 17-гадовы Уладзімір Ульянаў? Гэта быў ужо досыць вялікі горад. Разгорнем газету «Волжский вестник» ад 1 сакавіка 1888 года. У ёй артыкул «Фабрычна-заводская прамысловасць горада Казані ў мінулым 1887 годзе».

**«У горадзе Казані існавала ў 1887 годзе 25 галін прамысловасці... Працавала 73 фабрыкі і заводы... Рабочых на фабрыках было чатыры тысячы 159 чалавек; у тым ліку дзве тысячы 977 мужчын, тысяча 70 жанчын, 72 хлопчыкі і 40 дзяўчынак (да 15 год)...».**

А пра казанскае студэнцтва піша Максім Горкі, які жыў у той час у Казані, у кнізе «Мае універсітэты»:

**«Студэнты жылі ў настроі турбот аб рускім народзе, у бесперапыннай трывозе аб будучыні Расіі. Заўсёды ўзбуджаныя артыкуламі газет, вывадамі толькі што прачытаных кніг, падзеямі ў жыцці горада і універсітэта, яны па вечарах збягаліся ў лавачку Дзеранкова з усіх вуліц Казані для шаленых спрэчак і ціхага шэпту па вуглах».**

У лавачцы Андрэя Дзеранкова, што знаходзілася на ўскраіне Казані, была лепшая ў горадзе бібліятэка забароненых і рэдкіх кніг.

Магчыма, што яе наведваў і Уладзімір Ульянаў. Але гэта магло быць потым... Калі ён стане студэнтам. А ў чэрвені 1887 года Уладзімір Ільіч у Казані затрымаўся нядоўга. Ён выязджае ў вёску Какушкіна, дзе знаходзіцца разам са сваімі роднымі амаль да канца ліпеня.

29 ліпеня 1887 года Уладзімір Ільіч падае на імя рэктара Казанскага універсітэта прашэнне. На ім з'явілася першая рэзалюцыя: «Адтэрмінаваць да атрымання характарыстыкі».

Праз некалькі дзён у канцылярыю універсітэта паступіла характарыстыка з Сімбірскай гімназіі на Уладзіміра Ульянава. А 13 жніўня на прашэнне Уладзіміра Ульянава з'явілася другая рэзалюцыя: «Прыняць».

Не спяшаючыся хаджу па вуліцах Казані. Разглядаю старадаўнія будынкі, вежы Казанскага Крамля. Вуліца Леніна. Раней яна называлася Першая Гара. Тут у доме Растовай з канца жніўня пасялілася сям'я Ульянавых. Праз месяц Марыя Аляксандраўна разам з дзецьмі пераехала на вуліцу Нова-Камісар'яцкую, якая цяпер называецца вуліцай Комлева.

Тут амаль усё змянілася. На месцы драўляных будынкаў выраслі шматпавярховыя цагляныя жылыя дамы, школы, бальніцы, бібліятэкі.

Чым бліжэй да універсітэта, тым часцей сустракаюцца купкі маладых людзей. Яны ажыўлена перагаворваюцца, спрачаюцца. Студэнты! Хутка ж пачнуцца заняткі.

А вось і ён — белакаменны, упрыгожаны каланадай — Казанскі універсітэт. Уваходжу ў вестыбюль і, амаль не затрымліваючыся, іду на другі паверх. Аўдыторыя № 7. Тут усё захавалася так, як было ў тыя далёкія гады, калі студэнт Уладзімір Ульянаў слухаў лекцыі па гісторыі рускага права.

Своеасаблівы музей — аўдыторыя. Вялікі партрэт студэнта Ульянава, шматлікія дакументы, успаміны, у якіх расказваецца пра яго дзейнасць у казанскі перыяд.

Уладзімір Ульянаў акунуўся, як кажуць, з галавою ў бурлівае студэнцкае жыццё. Ён паспявае пагуляць з таварышамі ў шахматы, паспрачацца, прачытаць новую забароненую кніжку і, вядома, прыняць удзел у пасяджэннях тайных студэнцкіх гурткоў.

Вось цікавы дакумент — паведамленне дэпартамента паліцыі папячыцелю Казанскай вучэбнай акругі, датаваны 27-ым лютым 1887 года, якраз за некалькі месяцаў да паступлення Уладзіміра Ульянава ва універсітэт: «...сярод студэнтаў Казанскага універсітэта існуе 20 студэнцкіх гурткоў, якія ахопліваюць дзве трэці агульнай колькасці вучняў і паступова ўцягваюць астатніх членаў».

Паўстае пытанне — чаму менавіта студэнцкімі гурткамі займалася паліцыя? Справа ў тым, што ў тыя гады царскі ўрад забараніў усялякія студэнцкія арганізацыі і пачаў ажыццяўляць шэраг даволі жорсткіх мерапрыемстваў у адносінах да вучнёўскай моладзі. Гэта было выклікана тым, што ўдзельнікамі замаху на цара Аляксандра III былі ў асноўным студэнты.

Перадавая моладзь не спыняла сваёй дзейнасці, з'ўляліся, як сведчаць паліцэйскія дакументы, падпольныя арганізацыі — зямляцтвы, у якіх гуртаваліся студэнты-землякі.

Першакурснік Уладзімір Ульянаў быў дэпутатам ад свайго Сімбірскага зямляцтва.

Дакументы, успаміны розных людзей — былых студэнтаў Казанскага універсітэта, паліцэйскія даносы... Перагортваю пажоўклыя ад часу старонкі часопісаў, газет, і на мяне нібы дыхае вецер той эпохі. Усё выразней паўстае вобраз студэнта Уладзіміра Ульянава.

Чытаю ўспаміны былога студэнта Казанскага універсітэта М. М. Аляксеева:

**«Памятаю Уладзіміра Ільіча на Студэнцкай вуліцы, здаецца, у доме Комлева. Было гэта напярэдадні хваляванняў. У цесным гуртку за шклянкай чаю ішлі спрэчкі, і вось тут Уладзімір Ільіч сціпла, але пераканаўча гаварыў аб вучэнні Маркса і зачытваў некаторыя месцы з папулярнай у той час брашуры з дэвізам Някрасава: «В мире есть царь, этот царь беспощаден — голод названье ему». Між іншым, тут жа ён спытаў, ці няма ў каго гектографа, каб размножыць гэтую брашуру. Гектограф быў у мяне, і мы далі абяцанне надрукаваць экземпляраў дваццаць-дваццаць пяць, з іх 15 мы павінны былі даць Уладзіміру Ільічу, ён хацеў распаўсюдзіць іх у рабочых гуртках — здаецца, на заводзе Крастоўнікава».**

А вось паведамленне начальніка Казанскага губернскага жандармскага ўпраўлення палкоўніка Гангардта:

**«...Менавіта на зямляцкіх сходах было пастаўлена і вырашана пытанне, каб правесці ў горадзе Казані хваляванні па прыкладу хваляванняў, што адбыліся ў Маскве...»**

Палкоўнік Гангардт не памыляўся. 3-га снежня адбыўся сход прадстаўнікоў зямляцтваў, на якім прысутнічаў студэнт Уладзімір Ульянаў. На сходзе выступіў пасланец з Масквы і расказаў аб падзеях у Маскоўскім універсітэце. Тут жа была выпрацавана Петыцыя на імя рэктара Казанскага універсітэта, вызначаны час і тактыка выступлення.

Вышэй я пісаў, што ў 1887 годзе царскі ўрад пачаў ажыццяўляць шэраг мерапрыемстваў, накіраваных супраць студэнтаў. Уводзіўся ў дзеянне новы ўстаў, які забараняў студэнцкія сходы, гурткі і гэтак далей. Да таго ж, у 1887 годзе выйшаў цыркуляр міністра народнай асветы графа Дзялянава, па якому забараняўся прыём у навучальныя ўстановы дзяцей беднякоў. У гісторыю гэты ганебны дакумент увайшоў пад назвай «Цыркуляр аб жухаравых дзецях». Супраць яго і царскага ўставу выступілі маскоўскія студэнты, за імі студэнты іншых гарадоў.

4-га снежня 1887 года. Ва універсітэце цішыня. Ідуць заняткі. Гадзіннік б'е 12 удараў. І раптам па калідорах разнеслася: — На сходку!

— На сходку! На сходку!

Грукаюць дзверы, тупат ботаў, крыкі, гоман. І вось ужо актавая зала запоўнена студэнтамі. Нехта ўзбіраецца за кафедру:

— Таварышы! Паклянёмся, што мы ўсе, як адзін чалавек, будзем адстойваць нашы патрабаванні.

У адказ нясецца:

— Клянёмся!

— Клянёмся!

Да кафедры праціскаецца інспектар Патапаў:

— Панове! Панове!

Гоман мацнее.

— Імем закона запрашаю вас разысціся! — загадвае ён.

— Далоў!

— Дзяржыморда!

— Прэч адсюль! А то....

Раздаецца апляўха.

— Вы за гэта адкажаце! — Патапаў хоча яшчэ нешта сказаць, але голас патанае ў гомане студэнтаў:

— Бі яго! Бі! Крэслам!

— Рэктара!

— Сюды рэктара!

— Панове! Ціха!

— Цішэй!

На кафедру ўзыходзіць рэктар, прафесар Крамлёў, і пачынае глухім голасам:

— Я прыйшоў... Я прыйшоў, каб прапанаваць вам разысціся, інакш... інакш я вымушаны паклікаць паліцыю, салдат.

— Просім, пан рэктар, выслухаць нас і прыняць Петыцыю.

— Я ведаю, чаго студэнты жадаюць... права сходак... Але кончыць яму не даводзіцца.

— Не толькі. У нашай петыцыі ёсць і нешта іншае. Калі ласка, паглядзіце... — студэнт працягвае яму петыцыю. Рэктар разгортвае паперу, ледзь прыглушаным голасам чытае: «Склікала нас сюды не што іншае, як усведамленне немагчымасці ўсіх умоў, у якія пастаўлена рускае жыццё наогул і студэнцкае ў прыватнасці, а таксама жаданне звярнуць увагу грамадства на гэтыя ўмовы і прадставіць ураду ніжэйнайменаваныя патрабаванні».

— Хто гэта ўпаўнаважыў вас гаварыць аб немагчымасці рускага жыцця наогул?

— Народ!

— Нашы браты!

— Панове, панове! Цішэй! — працягвае зноў чытаць, — «...Для ўсіх расійскіх універсітэтаў устаў павінен быць адзін: ...Права мець свае бібліятэкі, чытальні... ....Знішчэнне ...усялякіх перашкод для паступаючых ва універсітэт. ....Справядлівасць патрабуе, каб усе нашы таварышы — усіх універсітэтаў, выключаныя з прычыны студэнцкіх хваляванняў, былі зноў прыняты».

А ў гэты час з Пецярбурга паступалі кароткія тэлеграмы-загады міністра народнай асветы графа Дзялянава:

«У выпадку хваляванняў дзейнічаць без паслаблення». «Для выратавання палітычна надзейных не шкадуйце нягоднікаў».

У сваю чаргу, папячыцель Казанскай вучэбнай акругі паведамляў міністру народнай асветы:

«Запрошаныя на ўсялякі выпадак войскі ў складзе батальёна з баявымі патронамі знаходзяцца на пастаяннай варце ў розных частках горада. У выпадку паўтарэння сходак і іншых хваляванняў будуць ужыты энергічныя меры».

Пачаліся вобыскі, арышты ўдзельнікаў студэнцкіх хваляванняў. Самых актыўных выключалі з універсітэта.

«За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях, якія адбыліся ў снежні 1887 года, выключан з універсітэта...» — Гэта запісана ў даведцы дэпартамента паліцыі аб Уладзіміру Ільічу Леніну.

«Уладзімір Ільіч быў арыштаваны на кватэры з 4 на 5 снежня і праседзеў некалькі дзён з іншымі арыштаванымі пры ўчастку (усяго 40 чалавек)», — успамінала пазней Анна Ільінічна Ульянава.

А вось другія ўспаміны — успаміны Яўгена Мікалаевіча Фоса:

«Нягледзячы на арыштанцкія халаты, у якія нас апранулі, на тое, што многія больш сутак нічога не елі... сярод моладзі панавала радасна-вясёлае ўзбуджэнне: складалі прозай і вершамі заклікі «на волю», спявалі рэвалюцыйныя і звычайныя студэнцкія песні, расказвалі розныя эпізоды апошніх дзён.

Камусьці прыйшло ў галаву правесці «анкетнае апытанне»... Калі настала чарга студэнта Ульянава і яму было зададзена ў паўжартаўлівым тоне пытанне: «Ну, а ты, Ульянаў, што думаеш рабіць потым?» — ён пасля некаторай паўзы, нібы апамятаўшыся ад задумення, ледзь усміхнуўшыся, адказаў: «Мне што ж думаць... Мне сцяжынка пракладзена старэйшым братам»... — і адразу ў камеры сціхлі гоман і смех, — успомнілі, што ўсяго паўгода назад старэйшы Ульянаў быў пакараны смерцю за замах на Аляксандра III... І жудасна, і няёмка зрабілася ўсім ад гэтага простага, без усякай эфектацыі, адказу».

Пазней, значна пазней усе бурлівыя казанскія падзеі ўкладуцца Уладзімірам Ільічом Леніным у кароткі, сціплы радок анкеты:

«Удзел у студэнцкіх рухах (1887 год)».

**П. ТКАЧОЎ.**



*Гэты эпізод са студэнцкага жыцця выхапіў аб'ектыў фотаапарата. Здагадацца не цяжка: дзяўчаты-філолагі вырашылі ў апошнія хвіліны перапынку заглянуць у канспект, каб выкладчык не застаў знянацку.*

Фота І. Аскіркі.

# НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ

У зале настольных гульняў Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната адбылася таварысцкая сустрэча па настольнаму тэнісу паміж зборнымі камандамі рабочых-камвольшчыкаў і в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта. Сваю спартыўную сустрэчу в'етнамскія студэнты і рабочыя камвольнага камбіната прысвячаюць Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі.

* * *

Сёння ў Палацы культуры прафсаюзаў адбудзецца гарадскі вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі, у якім прымуць удзел студэнты з розных краін і кантынентаў. Са сцэны прагучаць галасы ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці з ліку в'етнамскіх, кубінскіх і афрыканскіх студэнтаў.

◆ РОЗДУМ ◆ ПРАПАНОВЫ ◆ КАРЫСНЫ ВОПЫТ

# КАФЕДРА І СТУДЭНТЫ

**Бурнае развіццё прыродазнаўчых навук і тэхнікі ставіць у цяперашні час рад складаных праблем перад вышэйшымі навучальнымі установамі. Адна з гэтых праблем заключаецца ў тым, каб падрыхтаваць студэнтаў да будучай актыўнай творчай працы, да ўмелага выкарыстання ведаў, атрыманых на студэнцкай парце, і звестак, пачэрпнутых з літаратуры, для рашэння разнастайных задач, якія будуць няспынна ўзнікаць у іх практычнай дзейнасці. Найбольш дзейсны сродак дасягнуць гэтага — прыцягненне ўсіх студэнтаў абавязковым чынам да навукова-даследчай работы, перабудова навучальнага працэсу такім шляхам, каб кожны студэнт змог набыць элементарныя навыкі даследчай работы.**

**Я не бяруся судзіць аб якасці навучальнага працэсу пры падрыхтоўцы спецыялістаў па ўсіх прыродазнаўчых навуках і тым больш тэхнічных спецыяльнасцях, а закрану толькі падрыхтоўку хімікаў ва універсітэтах. Мабыць, цяжка прад'явіць сур'ёзныя прэтэнзіі да вучэбнага плана хімічнага факультэта і да праграм вывучаемых дысцыплін у адносінах аб'ёму ведаў, якія мяркуецца даць студэнтам ва універсітэце. А вось з методыкай навучання справа пастаўлена не зусім нармальна. Выкладчыкі, па сіле складзеных традыцый, празмерна апякаюць студэнтаў на лабараторных занятках, забяспечваючы іх падрабязнымі інструкцыямі па методыках выканання лабараторных работ, на семінарскіх занятках і экзаменах прапаноўваюць пытанні, адказы на якія яны могуць цалкам знайсці ў падручніках.**

**На выкананне курсавой работы вучэбны план адводзіць так мала часу, што ад студэнтаў, як правіла, нельга запатрабаваць большага, чым напісання невялікага агляду па найбольш даступных літаратурных крыніцах. Толькі выконваючы дыпломную работу, студэнт вымушан праяўляць неабходную самастойнасць, паколькі гэта работа ўяўляе сабой невялікае даследаванне. Але студэнт, які ніколі на малодшых курсах не сутыкаўся з даследчай дзейнасцю, сустракаецца з такой колькасцю складаных праблем, што перад кіраўніком часта ўзнікае дылема: або цалкам падпарадкаваць сваёй волі дыпломніка, не разлічваючы на яго ініцыятыву, або паставіць пад пагрозу выкананне дыпломнай работы ў тэрмін. Традыцыі зноў бяруць верх, і на абароне дыпломнай работы нярэдка можна сустрэць студэнта, які даволі цьмяна разбіраецца ў сэнсе вынікаў праведзеных ім эксперыментаў.**

**Вось і атрымліваецца: у спецыяліста на грудзях універсітэцкі значок, а пры выкананні сваіх абавязкаў, ён адчувае сябе бездапаможным, хоць і ведае не так ужо і мала. Нямала прыходзіцца папрацаваць маладому выпускніку, які не займаўся даследчай работай, пакуль набудзе элементарныя навыкі прымянення сваіх ведаў на практыцы, прычым гэты этап пераадольваюць не ўсе.**

**У многіх вышэйшых навучальных установах, на многіх кафедрах ужо даўно вядуцца пошукі таго, як можна змяніць навучальны працэс такім чынам, каб студэнт набываў навыкі творчага выкарыстання сваіх ведаў не пасля атрымання дыплома, а на студэнцкай парце. У гэтым кірунку вядуцца пошукі і на кафедры неарганічнай хіміі нашага універсітэта. Пакуль што нашы дасягненні невялікія, але, на мой погляд, мы сталі на правільным шляху. Перш за ўсё мы звярнулі ўвагу на методыку правядзення лабараторных заняткаў са студэнтамі старэйшых курсаў, якія спецыялізуюцца па нашай кафедры. Гэтыя заняткі ў апошні час будуюцца такім чынам, каб студэнты амаль не выконвалі звычайных лабараторных работ, а толькі займаліся складанымі эксперыментальнымі методыкамі — электроннай мікраскапіяй, электронаграфіяй, рэнтгенаграфіяй, інфаркраснай спектраскапіяй і некаторымі іншымі і значны адрэзак часу выкарыстоўвалі на работы навукова-даследчага характару або засваенне дастаткова складанай эксперыментальнай методыкі, якая раней не была засвоена на кафедры. Так, у гэтым годзе група студэнтаў-неарганікаў чацвёртага курса наладжвае на практыкуме адну з методык вырошчвання монакрысталаў і засвойвае спосаб правядзення так званых транспартных рэакцый. Другая група даследуе уласцівасці розных слаба вывучаных злучэнняў.**

**Калі студэнт згодзен выконваць прапанаваную яму на практыкуме тэму і ў пазалекцыйны час, ён па гэтай жа тэме можа падрыхтаваць эксперыментальную курсавую работу. Некаторыя з іх атрымліваюцца настолькі цікавымі і змястоўнымі, што заслугоўваюць прадстаўлення на агляды. У мінулым годзе, напрыклад, работы студэнтаў Г. Кажушкова і М. Кароткінай на рэспубліканскім аглядзе былі аднесены да першай катэгорыі, а работы Т. Панасюк, В. Балцэвіч, С. Райхман — да другой катэгорыі. Мы спадзяемся, што і ў гэтым годзе сярод удзельнікаў агляду будуць студэнты, якія спецыялізуюцца па нашай кафедры.**

**Вопыт практыкумаў па такой методыцы мы будзем удасканальваць.**

**Вялікія рэзервы закладзены ў вытворчай практыцы, але, на жаль, іх нялёгка выкарыстоўваць, таму што методыка правядзення вытворчай практыкі залежыць не толькі ад кафедры, але і ад заводаў і іншых устаноў, дзе яна праводзіцца. Аднак пры жаданні і некаторай настойлівасці адказных за вытворчую практыку можна арганізаваць удзел студэнтаў у распрацоўцы або ўдасканаленні якіх-небудзь метадаў аналізу або асобных тэхналагічных аперацый і г. д.**

**Магчыма, мэтазгодна часцей накіроўваць студэнтаў-хімікаў на вытворчую практыку ў навукова-даследчыя установы або пакідаць іх для гэтага ва універсітэце, маючы на ўвазе, што пасля заканчэння універсітэта больш складана набыць вопыт даследчай работы, чым запоўніць прабел, звязаны з недастатковым знаёмствам з вытворчасцю. Асабліва неабходна такая практыка для тых, хто пасля заканчэння універсітэта будзе займацца навукова-даследчай работай. У мінулым годзе наш студэнт Г. Кажушкоў праходзіў практыку на кафедры радыяцыйнай хіміі Томскага палітэхнічнага інстытута. Ён засвоіў рад методык вывучэння электрафізічных уласцівасцей парашкападобных рэчываў. Набыты ім вопыт перадаецца супрацоўнікам нашай кафедры і дапаможа Г. Кажушкову ў рабоце над дысертацыяй, да якой ён прыступіць пасля заканчэння універсітэта. Студэнтка Т. Луцкіна, якая была астаўлена для практыкі ва універсітэце, правяла даволі складаныя работы-пошукі па даследаванню механізма фатоліза некаторых солей жалеза, што адносяцца да тэмы, якую наша кафедра распрацоўвае сумесна з адной з лабараторый Інстытута кінетыкі ў Новасібірскім акадэмгарадку. Гэту работу Т. Луцкіна прадоўжыла як дыпломную і, магчыма, будзе прадаўжаць у якасці дысертацыйнай у аспірантуры.**

**У гэтым годзе мы пасылаем на практыку ў Новасібірскі інстытут кінетыкі двух студэнтаў з даволі сур'ёзнымі заданнямі.**

**Мэтазгодна прыцягваць да даследчай дзейнасці не толькі студэнтаў старэйшых курсаў, але і першакурснікаў, прычым не толькі ў працэсе іх работы ў навукова-даследчым гуртку, але і ў час лабараторных заняткаў. Так, выкладчыкі нашай кафедры адказаліся ў навучальным працэсе ад празмерна падрабязных апісанняў методык сінтэзу і стараюцца прапаноўваць студэнтам методыкі сінтэзаў без дэталізацыі, у такім выглядзе, што ім даводзіцца самастойна ўдакладняць ход некаторых аперацый. Бывае, што студэнты самастойна распрацоўваюць методыкі асобных сінтэзаў або вывучаюць магчымасці змянення методык, апісаных у літаратуры.**

**З наступнага навучальнага года мы плануем значна пашырыць у практыкуме першакурснікаў работы даследчага ці паўдаследчага характару. Гэта дазволіць актывізаваць навуковую працу студэнтаў у пазалекцыйны час. Іменна такім шляхам прыйшлі «ў навуку» ў мінулым годзе некалькі студэнтаў першага курса, якія ў цяперашні час ужо моцна ўвайшлі «ў штат» студэнтаў-даследчыкаў нашай кафедры.**

**На рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых работ у мінулым годзе кафедра неарганічнай хіміі прадставіла 13 работ. Па крайняй меры, палова з іх з'явілася ў выніку таго, што мы ў нейкай ступені ўкаранілі даследчую работу ў навучальны працэс.**

**Натуральна, навыкі актыўнага выкарыстання сваіх ведаў набываюцца студэнтамі не толькі пры выкананні даследчай работы. Значную ролю адыгрывае змест лекцый і семінарскіх заняткаў, змест тых разліковых задач, якія рашаюцца студэнтамі, форма правядзення калоквіумаў па розных тэмах праграмы. Але пра ўсё гэта неабходна гаварыць асобна.**

**В. СВІРЫДАЎ,**
**загадчык кафедры неарганічнай хіміі, дацэнт.**

# БУДЗЬЦЕ ДОНАРАМІ!

Пераліванне крыві з'яўляецца адзіным сродкам выратавання людзей пры многіх атручваннях, цяжкіх траўмах, апёках, моцных лёгачных, кішэчных і іншых крывацёках. Яно дазваляе праводзіць складаныя хірургічныя аперацыі на сэрцы, вялікіх сасудах, лёгкіх. Без крыві немагчыма ўкараненне ў практыку такіх апаратаў, як «штучная почка», «штучнае сэрца», «штучныя лёгкія». З крыві донара рыхтуюцца даволі каштоўныя лячэбныя прэпараты.

Медыцынскія паказанні да пералівання крыві і яе кампанентаў з развіццём медыцынскай навукі і павышэннем якасці медыцынскага абслугоўвання насельніцтва ўсё больш і больш пашыраюцца. У сувязі з гэтым і неабходная колькасць донарскай крыві пастаянна павялічваецца. Гэтая патрэба можа быць вырашана дзякуючы развіццю масавага патрыятычнага руху за бясплатнае донарства.

У нас донарства пастаўлена пад строгі лячэбны кантроль.

Большасць донараў можа даць у год 200 мл крыві. Дача 200—400 мл крыві шкодна не ўплывае на здаровы арганізм, самаадчуванне донара застаецца добрым, працаздольнасць не парушаецца, запас крыві хутка папаўняецца.

Донарства ў нашай краіне ўсемагчыма заахвочваецца. Донарам у дзень здачы крыві даецца бясплатнае харчаванне, а пасля здачы — дні для адпачынку. Ім у першую чаргу даюцца і пуцёўкі ў санаторыі і ў дамы адпачынку.

У нас, у БДУ, ёсць донары, якія неаднаразова давалі кроў бясплатна. Сярод іх В. Гарбачоў, С. Дзмітрыеў (хімфак), В. Шакарышвілі, Ю. Громаў, М. Якубовіч, Н. Пікулік, В. Лазечны (геафак), Ю. Чыжоў, Л. Верабʼёў (матфак) Ю. Аляксандраў (юрфак) і многія іншыя. На гэтым тыдні яшчэ 76 студэнтаў здалі кроў.

Ф. РЭЗНІКАВА,
заг. здраўпункта БДУ.



Наступіў напружаны час для тых, хто праз некалькі месяцаў пакіне сцены універсітэта і прыступіць да самастойнай працы. Ніна Малечка — дыпломніца біялагічнага факультэта. Яна сур'ёзна рыхтуецца да абароны сваёй дыпломнай работы.

НА ЗДЫМКУ: Ніна МАЛЕЧКА праводзіць лабараторны вопыт.

Фота І. Аскіркі..

## ВА УНІВЕРСІТЭТАХ КРАІНЫ

● Бюро ВЛКСМ філалагічнага факультэта МДУ арганізавала цыкл лекцый для студэнтаў II і III курсаў, на якіх яны вучацца мастацтву перакладчыка. Праводзяцца заняткі на такім ўзроўні, што інакш як школай іх не назавеш. Усе, хто займаецца ў школе, добра ведаюць тую ці іншую замежную мову, і таму асноўнай задачай, як запісана ў статуце школы, лічыцца павышэнне ідэалагічнага ўзроўню студэнтаў і інтэрнацыянальнае выхаванне іх.

Тэматыка лекцый — разнастайная: лекцыі аб міжнародным становішчы і аб этыцы перакладчыка; па тэорыі сінхроннага перакладу і аб унутранай палітыцы СССР; па праблемах міжнароднага маладзёжнага руху і аб унутранай эканамічнай палітыцы Савецкага Саюза.

Тыя, хто закончыць школу, па рэкамендацыі камсамольскай арганізацыі будуць накіраваны на работу перакладчыкамі ў любое ведамства ці ўстанову. Акрамя таго, у дні летніх канікул яны змогуць праходзіць практыку па гэтай спецыяльнасці.

● «Калі быць выдатнікам, дык быць ім да канца. Па табе, таварыш выдатнік, судзяць аб калектыве, а таму ты не павінен быць раўнадушным да ўсяго, што адбываецца ў групе і на факультэце!» Пад такім дэвізам праходзіў злёт выдатнікаў Казахскага дзяржаўнага універсітэта імя С. М. Кірава.

● 15 красавіка пачалася студэнцкая навуковая канферэнцыя Ташкенцкага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Пераможцы I тура прымуць удзел у рабоце II тура, які будзе праходзіць у маштабах рэспублікі ў маі, а пераможцы апошняга паедуць на Усесаюзную канферэнцыю ў Маскву.

● Таварыства «Веды» Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта аб'ядноўвае 354 чалавекі, у тым ліку 11 дактароў навук і прафесараў, 120 кандыдатаў і дацэнтаў, 52 студэнты. За няпоўных два гады імі было прачытана 5800 лекцый. Прапагандысцкая, асветніцкая работа супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта атрымала высокую ацэнку. Каля ста лектараў былі ўдастоены ўрадавых узнагарод і ўзнагарод усесаюзнага, рэспубліканскага і гарадскога праўленняў таварыства «Веды».

# НАША ВЯСЕННЯЯ АФІША

## ФІНАЛ КРОСА,

прысвечанага 98 гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, адбудзецца ў парку Перамогі 24 красавіка а 16 гадзіне.

Дыстанцыя для мужчын — 3000 метраў, для жанчын — 1000 метраў.

## ЛЕКЦЫЯ

**на тэму «Савецкія даследаванні ў Арктыцы і Антарктыдзе» адбудзецца сёння ў 58 аўдыторыі біякорпуса.**

**Лекцыю чытае кандыдат геаграфічных навук, начальнік 11, 12 антарктычных і ўдзельнік многіх арктычных экспедыцый П. К. Сенько (Ленінград).**

## ВЕЧАР

*студэнтаў універсітэта, палітэхнічнага інстытута і курсантаў ваеннага вучылішча на тэму «Мы беззапаветна справе Леніна адданы» адбудзецца сёння ў 19 гадзін у памяшканні акруговага Дома афіцэраў.*

РЭЙД У ІНТЭРНАТ

## ДОМ ТВОЙ РОДНЫ

Пяць студэнцкіх год — гэта не толькі лекцыі і семінары, прылучэнне да навукі, культурных каштоўнасцей, грамадскай работы, гэта і пяць год жыцця ў інтэрнаце, праверка маральных якасцей, уменне жыць у калектыве.

Удзельнікі чарговага рэйду, арганізаванага рэдакцыяй газеты і прафкомам, вырашылі паглядзець, як жа жывуць нашы студэнты ў самым лепшым па ўмовах— інтэрнаце № 5 па вуліцы Кастрычніцкай. Новы сучасны будынак у комплексе са сталовай, душавыя, кухні — ці не гэта прадумовы ўзорнага быту? Аднак з першага кроку ўдзельнікі рэйду сутыкнуліся з элементарным беспарадкам. Перш за ўсё, у інтэрнаце дрэнна наладжана дзяжурства. Тут часта можна бачыць пабочных асоб, якія маюць нават асабістыя ключы ад пакояў. Многія дзяжурныя зневажаюць свае абавязкі, адседжваюць толькі патрэбны час, займаючыся сваімі справамі — чытаюць, рашаюць задачы. Пропускі правяраюцца не рэгулярна. Якраз перад гэтым у інтэрнаце пабываў інспектар адміністрацыйна - гаспадарчай часткі М. Я. Ляпіла і заўважыў, што ў пакоях 515, 404, 403, 402 знаходзіліся людзі, якія не мелі ніякіх адносін да інтэрната і прайшлі сюды без прад'яўлення дакументаў.

Бесперашкодна мінула дзяжурны пост і рэйдавая брыгада. Ніхто не пацікавіўся, што за людзі і чаго прыйшлі сюды.

Першым на нашым шляху аказаўся пакой 110. Жывуць тут гісторыкі першага-трэцяга курсаў. Відаць, каб ярчэй падкрэсліць сваю належнасць да гістфака, гаспадары на адной са сцен прымацавалі вялікі агітацыйны плакат. Побач з ім мірна суседнічаюць фотавітрыны-жыццяпісы, у цэнтры якіх партрэты жыхароў пакою. Над кожным ложкам сцяна поўнасцю занята фотаздымкамі. Увенчваюць гэту калекцыю паклоннікаў мастацтва цудоўны «партрэт» сабакі.

Яно, вядома, ушаноўваць сяброў чалавека нядрэнна, не забараняецца калекцыяніраваць нават асабістыя партрэты, але ж усяму сваё месца. Фотаздымкам — альбомы, плакату — адпаведнае памяшканне,— так думалі мы, пакідаючы жыллё гісторыкаў. Іх пакой прыдаў лірычны настрой, і ў астатніх міжволі трапляліся на вочы элементы мастацкага афармлення. У адных яны былі скромнымі— карты, малюнкі, у другіх іх замяняў далёка не мастацкі беспарадак: раскіданыя дзе папала кнігі, развешаная для прасушкі бялізна, неахайна кінутае на ложках і крэслах адзенне.

Мы праходзім пакой за пакоем, і ў большасці адна і тая ж карціна—няўтульна. Ложкі засланы рознымі стракатымі пакрываламі. І толькі ў адным, не лічачы яшчэ некалькі добрых пакояў, мы з задавальненнем затрымаліся. У 504 жывуць дзяўчаты-трэцякурсніцы матэматычнага факультэта Валя Кірсанава, Валя Сабалеўская, Люда Антонава, Галя Яўсеенка, Ліда Палішчук. У іх — па-дамашнему чыста і прыгожа. І тут няхітрая студэнцкая мэбля, але чысціня, акуратныя пасцелі, парадак на кніжнай паліцы, галінка ў вазачцы — і мяняецца аблічча жылля.

Валя Кірсанава і Валя Сабалеўская былі дома. Дзяўчаты займаліся. Адна рыхтавалася да семінара па палітэканоміі, а другая перакладала з англійскага артыкул з газеты. Адчувалася, што жывуць тут не проста людзі, якія любяць чысціню, а існуе калектыў, у якім паважаюць інтарэсы адзін другога. Гэтага не скажаш аб жыхарах ленпакоя на пятым паверсе — рабятах-матэматыках розных курсаў. У 9 гадзін вечара адзін з іх займаўся, прыладкаваўшыся да тумбачкі, двое ігралі ў шашкі, астатнія назіралі або займаліся сваімі справамі. На стале на ўсю моц грымеў прыёмнік.

Непрыемнае ўражанне пакінулі кухні — брудна, паўзмрок, холадна, шыбы на пятым паверсе, як і ў многіх пакоях, пабіты. «Велымі доўга гатаваць на электраплітках», — скардзяцца дзяўчаты.

Спускаліся мы з чацвёртага паверха з вялікай асцярогай, — як бы не паламаць ногі, бо адзін з нас ужо ахвяраваў каблукамі. Ні на адной з лесвічных клетак не гарэла святло.

**Рэйдавая брыгада: Е. ШЫНГЕРЭЙ, нам. старшыні прафкома, В. КУПЦОВА, старшыня жылбыткамісіі, М. ЛІПАЎКА, В. МАСКАЛІК, члены прафкома, А. НІКОЛЕНКА, супрацоўнік газеты.**

## СПОРТ



## БАЛЕЛЬШЧЫКІ НЕ ПАМЫЛІЛІСЯ

*Сустрэчы паміж лідарамі першынства вну БССР па валейболу былі найбольш напружанымі і цікавымі. Вынік сустрэч вырашаўся толькі ў апошняй пятай партыі. Студэнткі інстытута фізкультуры многа сілы аддалі гульні з нашымі дзяўчатамі. А на наступны дзень яны сустрэліся з дружнай камандай палітэхнічнага інстытута. Чатыры партыі не вельмі выявілі мацнейшых— 2:2. У пятай партыі дзяўчаты інстытута фізкультуры шмат разоў памыляліся і прайгралі яе. Такім чынам, да апошняга дня спаборніцтва без паражэнняў прыйшлі дзве каманды —палітэхнічнага інстытута і універсітэта.*

*Балельшчыкі чакалі цікавай барацьбы. І яны не памыліліся. Гульня была сапраўды цікавай і захапляючай.*

*Зладжанымі прыёмамі Наташа Савачкіна і Валя Трахіменка, Люда Антонава і Тамара Біч дапамаглі сваёй камандзе ўпершыню заняць ганаровае месца па валейболу ў праграме XI рэспубліканскай спартакіяды сярод вну першай групы.*

*Па заканчэнню сустрэчы лепшых ігракоў Люду Антонаву (універсітэт) і Ларысу Пемель (палітэхнічны інстытут) узнагародзілі прызамі.*

*М. КУЧЫНСКІ, выкладчык кафедры фізвыхавання і спорта.*



НА ТРЭНІРОЎЦЫ. Фота В. Озерава.



## ЦУДОЎНАЯ СЯМЁРКА

Закончылася першынство універсітэта па ручному мячу сярод жаночых каманд. У апошнім матчы, які павінен быў выявіць пераможцу, сустрэліся каманды матэматычнага і фізічнага факультэтаў. Лепшую ігру прадэманстравалі студэнткі матэматычнага факультэта. Яны перамаглі з лікам 10:7.

У пераможцаў у фінальным матчы лепшымі былі Ларыса Макрусёва і варатар каманды Ліда Карчага.

НА ЗДЫМКУ: (злева направа) Ніна РАІНЧЫК, Ларыса МАКРУСЁВА, Валянціна ГУЛІДЗІНА, Ліда ГАЛЕНДА, Валянціна ДАЎГУЧЫЦ, Ліда КАРЧАГА, Зіна БАРЫСЕВІЧ. *Фота А. АСТАПАВА.*

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

АТ 02168 Зак. 650. Наш адрас: Універсітэцкі гар адок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».